Известия Гомельского государственного университета
имени Ф.Скорины, №1 (10), Беларуская мова – 26, 2002

# Адыменныя дзеяслоўныя і субстантыўныя новаўтварэнні ў мове твораў маладнякоўцаў

Л.П.Сачанка

Жыватворнай крыніцай папаўнення і ўзбагачэння мовы ў пачатку 20-х гадоў была народная мова і тыя словы, якія ствараліся пісьменнікамі. Шмат лексем, што выкарыстоўваліся ў творах тых часоў, сёння чытачу незразумелыя. Але ў свой час яны не толькі папаўнялі лексічную сістэму беларускай мовы, а і падштурхоўвалі маладых паэтаў да актыўнага пошуку лексем у народных гаворках, стварэння новых слоў. Таму нават тыя словы, што сёння здаюцца вымушанымі, нязвыклымі, штучнымі, былі неабходныя ў той час, такая моватворчасць была карыснай для беларускай літаратурнай мовы, якая пачынала выкарыстоўвацца ў многіх сферах ужытку і патрабавала новых сродкаў.

У дадзеным артыкуле падаецца аналіз адыменных дзеяслоўных і субстантыўных новаўтварэнняў.

1. Дзеясловы прадстаўлены новаўтварэннямі ад іменных асноў, якія характарызуюцца ў розных аспектах у залежнасці ад спецыфікі часціны мовы. Побач з семантычнай характарыстыкай новаўтварэнняў у артыкуле разглядаецца словаўтварэнне.

Сама назва адыменныя дзеясловы дапускае папярэднюю наяўнасць "імён", аднакаранёвых па форме і суадносных па значэнні, ад якіх маглі ўтварыцца гэтыя дзеясловы, так як "вытворная аснова без наяўнасці ўтваральнай у сапраўднасці не існуе"[1]. З'яўленню, напрыклад, у мове твораў слоў раскуміць, ускоўдрыць, іглініць павінны былі папярэднічаць назоўнікі кума, коўдра, гліна.

1.1. Ад іменных асноў дзеясловы ўтвараліся пераважна суфіксальным спосабам пры дапамозе суфіксаў -і- (-ы-), -ава- (-ява-), -ніча-:

1.1.1. Самая вялікая група адыменных дзеяслоўных дэрыватаў утварылася пры дапамозе суфікса -і- (-ы-) і называе дзеянне паводле значэння ўтваральнай асновы:

струменіць 'біць, бурліць':

Я малады,
У сэрцы кроў струменіць,
Істота ўся гарыць (М.Чарот. Я малады);

навальнічыць 'бурліць, разлівацца':

Праз палі, праз нізіны і ўзвышшы,
праз кудлатую сінь лясоў,
бачу, як навальнічыць выйшаў
з берагоў крутарогіх Сож
(А.Дудар. Запляці залатую касу);

пляміць 'пакідаць след':

Брудным злётам ліплі на паркане,
Сонцалісты плямілі наш сад (У.Хадыка. Ліпень);

лявоніць 'скакаць, хавацца':

Беланогі расчухраны месяц
Лявоніць у лісці кляновым
Мне чупрыны не хочацца звесіць
У гэты вечар аўсяна-зялёны.
(Я.Пушча. Мне чупрыны не хочацца звесіць);

аўсяніць 'напаўняць водарам, хмяліць':

Вецер. Пад гаем
Песнямі поўдзень аўсяніць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(Я.Пушча.Вясновае);

цымбаліць ‘іграць, спяваць’:

Ужо гэтакі поўдзень буяе
У сэрцы маім маладым;
У ім песні базыраць буяна
І на новыя хочуць цымбаліць лады
(Я.Пушча. Вясновае);

маторыць ‘разрываць, напаўняць’:

Самалёты маторáць паветра;
Кожны быць хоча пілотам,
Узняцца за хмары, як птах
Тра-та-та! Тра-та-тах!
(Я.Пушча. Фантазіі не ў Азіі, а на Беларусі);

крышталіць, крышталіцца ‘ззяць, блішчаць’:

Сыплюцца каплі вады
І крышталяцца ў возеры сінім
(П.Трус. Буду я душы маладым);
Ціха хвалі крышталілі
ў далі, –
У пералівах іх чуўся напеў
Моўчкі лісце на дол ападала, –
Час красе адцвітання наспеў
(Я.Пушча. Дажынкавае);

крынічыць ‘біць, струменіць’:

Ці ж я не ведаю, ці ж я не знаю,
Ці я не сын сваёй сучаснасці, –
Жыццё крынічыць і музыкі граюць
(У.Дубоўка. Мой любы браце, блізкі і далёкі);

крыліцца ‘узлятаць, разносіцца’:

Блакітнай, як неба, дарогай Дзвіны
Крыляцца вясёлыя песні вясны
(А.Александровіч. Дзвіна);

капыціць ‘таптаць’:

А коней капыты капыцяць рунь, –
Вярнулася дзікунская пара
(Я.Пушча. Песня вайны);

гуслярыць ‘звінець, граць’:

Гуслярылі светлыя далі
на струнах лясных салаўёў
(Т.Кляшторны. Успамін);

камсамоліць ‘весяліць, радаваць’:

Калі хмель веснавы ў галаве
Калі сэрца пайшло камсамоліць
(А.Моркаўка. Хмель);
Сёння ўсё на свеце камсамоліць
(Т.Кляшторны. За кроснамі часу не прыкмеціш);

лучыніць ‘гарэць’:

Успаміны ў сэрцы лучыняць
Усе гавораць – зрабіўся я гіцаль,
Усе гавораць – я сэрца раскінуў
Пазалотанай рукавіцай
(А.Вольны. Успаміны ў сэрцы лучыняць).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1.1.2. Значная група адсубстантыўных дзеяслоўных дэрыватаў утворана пры дапамозе суфіксаў –ава- (-ява-) і мае значэнне ‘выконваць дзеянне паводле або з дапамогай таго, што названа ўтваральнай асновай’:

нітаваць ‘пранізваць’:

Думкі і вобразы
лучацца шчыльна
Сэрца нітуюць настры вясны
(П.Глебка. Трывожны сігнал);

цэнзураваць ‘правяраць’:

Твае лісты,
Я знаю, цэнзуруе
Цэнзура жорсткая –
Рука турмы фашыстаў
(М.Чарот. Лірычны ліст);

следкаваць ‘сачыць’:

Дзяўчына ахоча падала
Мне конаўку халоднае празрыстае вады,
А сама лагодна следкавала,
Як смагла я піў (У.Жылка. Народнае);

сітаваць ‘напаўняць’:

А песня расла, сітавала душу,
Ляцела ў вяршаліны сосен
(У.Дубоўка. Камсамолка Ганна).

1.1.3. Сустракаюцаа адзінкавыя прыклады адыменных дзеясловаў з суфіксам –ніча-, якія абазначаюць дзеянні, што маюць адносіны да таго, што названа ўтваральнай асновай:

юбілярнічаць ‘святкаваць’:

Хоць гэта ўжо дзевяты дзень святкавання юбілею, але сам пясняр сказаў стрыечнаму брату Язэпу, цалуючыся з ім, што гатоў юбілярнічаць дзень у дзень хоць яшчэ тры гады. (З.Бядуля. Язэп Крушынскі);

шляхетнічаць ‘выхваляцца’:

Шляхетнічаць няма чаго (Р.Мурашка. Сын).

1.2. Асобныя дзеясловы – адыменныя дэрываты ўтвораны прэфіксальна-суфіксальным спосабам:

1.2.1) пры дапамозе прэфікса на + суфікс -і- і маюць значэнне ‘дасягнуць дастатковай паўнаты або празмернасці дзеяння’:

надынаміціць ‘узарваць, выклікаць’:

Эй, хто там
Хто там невядома
Надынаміціў дзікі стогн
(Т.Кляшторны. Стыхія);

1.2.2) рас + -і- (-ы-) – ‘мнагакратна ажыццявіць дзеянне, накіраваць яго на многія ці ўсе аб’екты’:

распарасоніцца ‘разліцца’:

Раскалыхайся, сіняе мора,
Распарасонься, вада-ваданіца
(У.Дубоўка. Нафарбавала навошта вусны);

распаветрыцца ‘апусціцца’:

І ўзвее яна і пасцелецца
распаветрыцца на берагі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(У.Дубоўка. Залатая асенняя раніца).

1.2.3) у + -і- (-ы-) – ‘выканаць дзеянне, давесці яго да канца’:
ускрыліць ‘узняцца, напоўніцца’:

Імя, як ноч, глухое, Марта
Не зачаруе чулы слых,
Пагляд прыцішаны, упарты
Лятункамі не ўскрыліць дух (У.Жылка. Марта).

1.2.4) аб + -і- (-ы-) – ‘завяршыць дзеянне цалкам, канчаткова’:
абрадзіміцца ‘з’явіцца, нарадзіцца’:

Абрадзіміцца ён
Новы дзень
Папараць-кветкаю
(У.Жылка. Уяўленне).

1.2.5) за + -і- (-ы-) – ‘пачаць дзеянне’:
закрынічыць ‘пачаць актыўна рухацца’:

Кроў у нас хай закрынічыць
Завіхрыцца дух вірам,
Хай імпэт наш чараўнічы
Бомкне гора перуном
(У.Дубоўка. Спагадае хто?).

1.2.6) ад + -іва- – ‘абазначае працяглае неабмежаванае дзеянне’:
адкаваліваць ‘адразаць’:

Адкаваліваюць скібы
Коні гакамі падкоў
Робіць поле на сядзібы
З воспай выбітых карчоў
(П.Трус. Калі хочаш, каб быў ураджай).

1.2.7) і + -і- (-ы-) – ‘ажыццяўляць пэўнае дзеянне’:
ігліniць ‘афарбоўваць’:

Раскалыхалася мора ў запале,
пенаю плача, ігліniць пырскі
(У.Дубоўка. Нафарбавала навошта вусны.).

1.3. Ад прыметнікавых асноў дэрываты ўтварыліся суфіксальным спосабам і абазначаюць дзеянне паводле прыметы, названай утваральнай асновай:
імклівіць ‘падганяць’:

У прасцяг празрыста-нязнаных,
Думка імклівіць несупынны лёт
(У.Дубоўка. Святкую дубэльты сваіх выгнанняў);

кучаравіцца ‘убірацца ў цвет, распускацца’:

Ужо кучаравяцца бярозы
Няма ні холаду, ні цьмы
(В.Маракоў. Над сінім лесам, шэрым полем);

ружовіць ‘афарбоўваць у ружовы колер’:

Калі зара ружовіла абшары, –
Я пазіраў, як стылі хмары
(А.Моркаўка. Я жыў);

цвятлівіць ‘упрыгожваць, асвятляць’:

Соўкала човен нямое прадонне
Месяц і сонца цвятлівілі шлях
(У.Дубоўка. Пачалося з-пад хмар вандроўных);

вішнёвіць ‘палымнець, узбуджаць’:

А ў грудзях сярмяжных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ой вішнёвіць жар
(П.Трус. Ой, люблю).

Аналізуемыя тыпы адыменных дзеясловаў складаюць актыўны, пашыраны пласт лексікі твораў маладнякоўцаў. Усе яны характарызуюцца прадуктыўнасцю, але не аднолькавай. Самым прадуктыўным з'яўляецца тып дэрыватаў, што паходзяць ад назоўнікаў і ўтвораны пры дапамозе суфіксаў -і- (-ы-). Важным фактарам такога адыменнага дзеяслоўнага ўтварэння з'яўляецца характар канцавога гука ўтваральных асноў. Назіранні паказалі, што ў перадсуфіксальным становішчы часцей аказваюцца санорныя р, н', л', а таксама пярэднеязычныя палаталізаваныя ц', дз' і цвёрды ч.

У выключнай большасці семантыка адыменных дзеяслоўных новаўтварэнняў з'яўляецца метафарычнай, прычым пераносны сэнс актуалізуецца ў вытворнай лексічнай адзінцы, тады як утваральная аснова, як правіла, пазбаўлена гэтага значэння.

2. Значную групу аўтарскіх слоў складаюць назоўнікі, якія ўтвараюцца ад асноў прыметнікаў, галоўным чынам, марфалагічным спосабам. Як вядома, марфалагічнае словаўтварэнне не вядзе да ўзнікнення ў мове абсалютна новых слоў. Яно аперыруе, па сутнасці, толькі новымі відамі камбінавання таго, што ўжо існавала раней, стварае новыя лексічныя адзінкі на базе наяўнага моўнага матэрыялу (асноў розных часцін мовы) і існуючых словаўтваральных сродкаў.

Словаўтваральны разрад назоўнікаў са значэннем абстрагаванай прыметы, якасці, уласцівасці і стану – самы багаты ў лексічных адносінах сярод адпрыметнікавых назоўнікаў.

2.1. Назоўнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфікса –асць. Па сваёй марфалагічнай будове назоўнікі разглядаемага тыпу неаднародныя. Яны ўтвараюцца ад невытворных, вытворных і складаных асноў прыметнікаў.

2.1.1. Аснова невытворнага прыметніка + -асць:

кволы – кволасць:

Але ў сэрцы не родзіцца кволасць,
Хоць і бачу я смерці курганы (М.Чарот. Я люблю).

2.1.2. Аснова вытворнага прыметніка + -асць. Назоўнікі на -асць утвараюцца ад вытворных асноў суфіксальных прыметнікаў з суфіксамі: -ав (-ов):

кармазынавы – кармазынавасць:

Пурпуровасць каліны, пунсовасць,
кармазынавасць дзікіх шыпшын…
(У.Дубоўка. Неба сіняе, сіняе вельмі);

каляровы – каляровасць:

Нямая бель … Гаі, Дубровы…
Маўчаць за возерам стагі,
Згубілі вербы каляровасць,
А там… снягі… снягі… снягі (П.Трус. Зіма);

-ёв-:

сталёвы – сталёвасць:

…няма сталёвасці і арфазвоннасці
(У.Дубоўка. Мой любы браце, блізкі і далёкі);

-н-:

чмарны – чмарнасць:

Імжа, і склізота, і прыкрая золь
За скрогатам ветру-навалай
У чмарнасць убралася светлая столь,
Блакіт ад зямлі адарвала (У.Дубоўка. Строма);

Сустракаюцца і прыставачна-суфіксальныя ўтваральныя асновы:

бязгутарны – бязгутарнасць:

О хараство асенніх дзён празрыстых,
Бязгутарнасць прыроды і спакой (У.Жылка. Восень).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2.1.3. Асновы складаных прыметнікаў + -асць. Ролю ўтваральных асноў назоўнікаў на –асць выконваюць складаныя прыметнікі падпарадкавальнага тыпу, утвораныя на базе словазлучэнняў прыметніка з назоўнікам:

арфазвонны – арфазвоннасць:

…няма сталёвасці і арфазвоннасці
(У.Дубоўка. Мой любы браце, блізкі і далёкі).

Як сведчыць прааналізаваны матэрыял, суфікс –асць з'яўляецца прадуктыўным словаўтваральным элементам адпрыметнікавых назоўнікаў у творах маладнякоўцаў.

2.2. Значная роля адводзіцца складаным словам, што ўтвараюць вялікую групу аўтарскіх адыменных субстантыўных новаўтварэнняў. Як правіла, утвараюцца яны шляхам аснова- і словаскладання назоўнікаў:

сонцацвет – сонца і цвет:

О вясна, светлых дзён хараство!
У сонцацвеце губляюцца мары.
(Я.Пушча. Светлых дзён хараство);

веснаплынь – вясна і плынь:

Зазвінелі зімовыя крыгі
Веснаплынь… (П.Трус. Вясна);

златаблеск – злата і блеск:

Аздобіў сакавік у златаблеск даліну,
Быў чысты, нібы шкло, абшар-прастор нябёс
(З.Бядуля. На прадвесні);

светацень – свет і цень:

Жыццё ў адвечных летуценнях
І ўсё аддам я для жыцця,
Калі ў чароўных светаценях
Над краем ружы шалясцяць
(П.Трус. Жыццё ў адвечных летуценнях);

электрасвітанне – электра і світанне:

Вось так расце
ў наш вялікі век
Краіна
электрасвітання
(Т.Кляшторны. І мільёнаў б'ецца ленінскае сэрца).

Звычайна складаныя субстантыўныя новаўтварэнні спалучаюць у сабе два кампаненты, адзін з якіх – распаўсюджаны, а другі – нечаканы, што надае навізну ўсяму ўтварэнню.

Са сказанага вышэй можна зрабіць наступныя вывады: новаўтварэнні з'явіліся ў мове твораў маладнякоўцаў невыпадкова, а ў сувязі з неабходнасцю перадаць новыя паняцці, якім не было адпаведнікаў у беларускай літаратурнай мове, а таксама таму, што нарматыўнымі лексічнымі сродкамі нельга было дакладна перадаць арыгінальнасць, навізну і свежасць выкладу.

Пэўны ўплыў на стварэнне разглядаемых дэрыватаў аказала і жывая народная мова.

## Літаратура

1.Мальцева И.М., Молотков А.И., Петрова З.М. Лексические образования в русском языке XVIII века. Л., 1975. – С. 249.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны

Паступіў 14.06.01

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ